# ПЦПІ – ГАРАНТ ПАВЫШЭННЯ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ НАСЕЛЬНІЦТВА: З ВОПЫТУ РАБОТЫ ГРОДЗЕНСКАЙ АБЛАСНОЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА

**ЗДРАДОЎСКАЯ Л.У.,**
загадчык аддзела інфармацыйна-бібліяграфічнай работы Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага

*У артыкуле разглядаецца вопыт работы публічнага цэнтра прававой інфармацыі Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага.*

*The experience of the Public Center of Legal Information of the Grodno Regional Scientific Library named by E.F.Karsky is considered in the article.*

Пры аддзеле інфармацыйна-бібліяграфічнай работы Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага на працягу 12 гадоў дзейнічае публічны цэнтр прававой інфармацыі (далей – ПЦПІ), які забяспечвае карыстальнікаў дакладнай, поўнай і своечасовай прававой інфармацыяй.

Дзейнасць ПЦПІ ўплывае на павышэнне ўзроўню прававой культуры, прававое выхаванне асобнага чалавека, дае магчымасць яму набыць навыкі выкарыстання нарматыўных прававых актаў і ўменне паводзіць сябе ў адпаведнасці з прававымі нормамі.

Важнасць заканадаўчых актаў сёння разумеюць усе: і радавыя грамадзяне, і кіраўнікі розных рангаў. Афарызм французскага пісьменніка Анарэ дэ Бальзака «ничто так плохо мы не знаем, как то, что каждый должен знать, – Закон» актуальны сёння як ніколі. Павышаная цікавасць да прававой інфармацыі звязана з пераменамі ў грамадстве і пастаянным ростам заканадаўчага патоку. Кожны грамадзянін павінен валодаць мінімумам прававых ведаў, неабходных для працы, паводзін у грамадстве, у бытавых абставінах.

У ПЦПІ сфарміраваны асноўны масіў юрыдычнай літаратуры. Гэта кодэксы, каментарыі заканадаўства, тэматычныя зборнікі прававых дакументаў, даведнікі, слоўнікі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі. У фондзе прадстаўлены перыядычныя выданні прававой тэматыкі, выданні міністэрстваў і ведамстваў, вышэйшых судовых органаў, юрыдычныя часопісы.

У распараджэнні ПЦПІ – інфармацыйна-пошукавыя сістэмы: «ЭТАЛОН» (далей – ІПС «ЭТАЛОН»), якая змяшчае банкі даных «Заканадаўства Рэспублікі Беларусь», «Рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання», «Міжнародныя дагаворы», «Правапрымяняльная практыка», «Судовая практыка»; «Эксперт»; «Юсіас».

Інфармацыйныя рэсурсы – як друкаваныя, так і электронныя – дазваляюць выконваць самыя разнастайныя запыты па грамадзянскім, сямейным, працоўным, жыллёвым, зямельным, экалагічным праве і іншых галінах права.

Як паказвае практыка, да прававой інфармацыі ў ПЦПІ звяртаюцца самыя розныя групы наведвальнікаў. Згодна са статыстычнымі данымі асноўнымі карыстальнікамі ПЦПІ з'яўляюцца студэнты (38,6 %) і прадстаўнікі эканамічнай, юрыдычнай, фінансавай сфер дзейнасці (29,2 %).

Тое, што асноўную частку наведвальнікаў складаюць студэнты, цалкам зразумела. Практычна ні адна кантрольная, курсавая, дыпломная работа не можа адпавядаць сучасным патрабаванням без апоры на заканадаўства. Захаванню попыту на прававую інфармацыю сярод названай групы карыстальнікаў садзейнічаюць

цесныя сувязі бібліятэкі з навучальнымі ўстановамі. На працягу многіх гадоў ПЦПІ падтрымлівае сувязі з юрыдычным факультэтам Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы, Беларускім інстытутам правазнаўства і каледжам бізнеса і права, якія знаходзяцца недалёка ад бібліятэкі. Традыцыйнымі сталі дні інфармацыі «Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі па праве» для студэнтаў першых курсаў.

Прадстаўнікі эканамічнай, юрыдычнай і фінансавай сфер дзейнасці — гэта ў асноўным супрацоўнікі арганізацый, якія не маюць доступу да прававых рэсурсаў і магчымасці карыстацца новай літаратурай прававой тэматыкі. Сярод іх многа тых, хто толькі пачынае сваю дзейнасць.

Асаблівай увагі патрабуюць сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва: пенсіянеры і інваліды. Гэту катэгорыю карыстальнікаў адрознівае ад астатніх тое, што яны, як правіла, не ўмеюць самастойна карыстацца камп'ютарам, не ведаюць канкрэтных дакументаў, а звяртаюцца з пэўнай прававой праблемай, якую неабходна вырашыць. Такія грамадзяне патрабуюць дадатковай увагі, паколькі, калі імкнуцца знайсці выйсце з той ці іншай жыццёвай сітуацыі, часта звяртаюцца з такімі праблемамі, якія пад сілу вырашыць толькі прафесіяналам. У гэтых выпадках на дапамогу і такім карыстальнікам, і ПЦПІ прыходзяць спецыялісты калегіі адвакатаў Ленінскага раёна г. Гродна, з якімі на працягу 10 гадоў ПЦПІ цесна супрацоўнічае. Штомесяц, у апошнюю сераду, яны даюць бясплатныя юрыдычныя кансультацыі. У 2012 годзе было дадзена 111 такіх кансультацый.

Пра эфектыўнае функцыянаванне ПЦПІ сведчаць факты. Так, у 2012 годзе да паслуг ПЦПІ звярнуліся 2038 карыстальнікаў, якія наведалі цэнтр 5224 разы. Гэта амаль у 2 разы больш, чым у пачатку дзейнасці ПЦПІ (2002 год). Колькасць выкананых даведак прававой тэматыкі ў 2012 годзе склала 4287, што амаль у 3 разы больш, чым у самым пачатку работы ПЦПІ.

Станоўчая дынаміка названых паказчыкаў абумоўлена тым, што ў ПЦПІ ёсць усе неабходныя ўмовы для якаснага інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў: камп'ютары, прынтары, капіравальны апарат, выхад у сетку Інтэрнэт, супрацоўніцтва з рэгіянальным цэнтрам прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці.

Штодзённае абнаўленне банкаў даных дае магчымасць своечасова прадаставіць карыстальнікам неабходную актуальную прававую інфармацыю, а таксама пастаянна сачыць за змяненнямі і дапаўненнямі, якія адбываюцца ў заканадаўстве. Значнасць электроннай базы даных як інфармацыйна-пошукавага рэсурса высока ацанілі і работнікі, і карыстальнікі. Час, затрачаны бібліёграфам пры рабоце з прававым дакументам, скараціўся ў дзясяткі разоў.

З мэтай больш поўнага раскрыцця фонду і прыцягнення новых карыстальнікаў прававой інфармацыі ў ПЦПІ афармляюцца кніжныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, праводзяцца масавыя мерапрыемствы, бібліятэкары асвятляюць дзейнасць ПЦПІ ў сродках масавай інфармацыі. Кніжныя выставы «Прававая інфармацыя на службе сацыяльнага прагрэсу», «Інфармацыйнае грамадства і прававая інфарматызацыя» пастаянна абнаўляюцца.

У мерапрыемствах, якія праводзяцца ў рамках ПЦПІ, актыўны ўдзел прымаюць прадстаўнікі улады, праваахоўных органаў, суддзі, дэпутаты.

Цікавым і змястоўным атрымаўся дзень інфармацыі «Прававая абарона спажыўцоў» у мінулым годзе. У ім прынялі ўдзел суддзі гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці, адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі «Юр-Эксперт», суддзя суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна. У ходзе мерапрыемства быў зроблены агляд нацыянальнага заканадаўства па абароне правоў спажыўцоў, разгледжаны асноўныя правы беларускага спажыўца, прыведзены найбольш частыя выпадкі парушэння заканадаўства з боку вытворцаў і спажыўцоў. Падчас дня інфармацыі наведвальнікі атрымалі адказы на хвалюючыя пытанні.

Добрыя водгукі чытачоў атрымлівае бібліятэка пасля традыцыйных сустрэч з прадстаўнікамі Камітэта дзяржаўнага кантролю, судоў, налогавай інспекцыі і абласной калегіі адвакатаў, якія праходзяць у форме пытанняў і адказаў.

Прававая асвета моладзі — важная задача цэнтра. Для вучняў старэйшых класаў штогод праводзяцца дні інфармацыі «Моладзь і закон» з удзелам прадстаўнікоў праваахоўных органаў.

Для бібліятэкараў аграгарадкоў вобласці на курсах павышэння кваліфікацыі праводзяцца практычныя заняткі па рабоце з ІПС «ЭТАЛОН».

Неаднаразова ПЦПІ рыхтаваў базу для правядзення рэспубліканскіх і абласных семінараў і канферэнцый па прававой асвеце насельніцтва.

У 2007 годзе адбыўся рэспубліканскі семінар «Дзейнасць публічных цэнтраў прававой інфармацыі па аказанні інфармацыйна-прававых паслуг насельніцтву» з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей — НЦПІ), Міністэрства культуры і Міністэрства юстыцыі. Канферэнцыя «Дыстанцыйная прававая дапамога насельніцтву Гродзенскай вобласці» з удзелам НЦПІ, рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы праводзілася ў 2009, 2010 гадах.

У мінулым годзе НЦПІ арганізаваў абласны навучальны семінар для супрацоўнікаў цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы вобласці.

Перспектывы развіцця прававога інфармавання і выхавання прававой культуры мы бачым у далейшым супрацоўніцтве з рэгіянальным цэнтрам прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці, калегіяй адвакатаў Ленінскага раёна, праваахоўнымі органамі, навучальнымі ўстановамі.

За гады свайго існавання ПЦПІ не страціў сваёй актуальнасці. Ён шырока разрэкламаваны, даступны для ўсіх пластоў насельніцтва, мае добрую рэпутацыю і вялікія магчымасці. На 1 кастрычніка 2013 г. у публічных бібліятэках Гродзеншчыны налічваецца 99 ПЦПІ. Інфармацыйныя рэсурсы ПЦПІ ў бібліятэках вобласці складаюць больш за 71,7 тысячы экзэмпляраў кніг і перыядычных выданняў. Кожны цэнтр забяспечаны электроннай копіяй эталоннага банка даных прававой інфармацыі з ІПС «ЭТАЛОН». За бягучы год карыстальнікамі ПЦПІ сталі каля 9 тысяч чалавек.

Нягледзячы на велізарны інфармацыйны паток, мноства юрыдычных кансультацый і службаў, бібліятэкі занялі сваю нішу ў сферы забеспячэння прававой інфармацыяй.

*Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю 29.10.2013*